# *ИСКУССТВОВЕДЕНИЕ*

**УДК 882.6.09-2**

## ПРЫМЕТЫ, ВІДЫ І СРОДКІ КАМІЧНАГА ЯК МАСТАЦКАЙ З'ЯВЫ

***І.Л. ДАНІЛЕНКА***
***(Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова)***

*Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца аналіз эстэтычнай і сацыяльнай сутнасці камічнага, яго асноўных прымет, відаў і сродкаў як мастацкай з'явы. Асноўнымі прыметамі камічнага можна лічыць смехавую прыроду, станоўчую або негатыўную ацэнку прадмета смеху, характарызацыю суб'екта смеху, лакалізацыю ў жыцці чалавека і грамадства, апора на памылкі, непаразуменні, недарэчнасці, адхіленне ад існуючых норм, адпаведнасць аб'ектыўным эстэтычным і/або этычным ідэалам, наяўнасць сацыяльна значнай неадпаведнасці, супярэчнасці, імкненне да сцвярджэння новага, прагрэсіўнага. Асноўнымі відамі камічнага з'яўляюцца гумар і сатыра, паміж якімі знаходзіцца вялікая колькасць адценняў смеху, якія па сваёй сутнасці з'яўляецца амбівалентным, што абумоўлівае сінкрэтычную прыроду камічнага як арганічнай часткі жыцця чалавека і грамадства. Камічны эфект дасягаецца рознымі сродкамі, якія могуць быць зместавымі (канфлікт, сітуацыя і г.д.) і фармальнымі (маўленчыя), і залежыць ад умелага выкарыстання як зместавых (нямоўных), так і фармальных (моўных) сродкаў, сярод якіх самымі дзейснымі з'яўляюцца моўныя (маўленчыя) сродкі.*

**Уводзіны.** Камічнае, як вядома, – адна з самых старажытных і складаных эстэтычных катэгорый, якой прысвечана шмат фундаментальных даследаванняў у самых розных галінах гуманітарных ведаў: філасофіі, тэорыі мастацтва, паэтыцы, псіхалогіі і г.д. [1 – 9], у тым ліку і ў мовазнаўстве [10 – 14]. Разам з тым пакуль што не склалася агульнапрынятага погляду на камічнае ні ў катэгарыяльным, ні ў тэрміналагічным сэнсе. Мэтай гэтага артыкула з'яўляецца аналіз эстэтычнай і сацыяльнай сутнасці камічнага, яго асноўных прымет, відаў і сродкаў як мастацкай з'явы.

**Асноўная частка.** Камічнае звычайна супрацьпастаўляецца трагічнаму. Трагічнае і камічнае ў жыцці не існуюць у чыстым выглядзе, а пераўтвараюцца адно ў адно, спалучаюцца паміж сабой і кантраст, які ўзнікае паміж імі, яшчэ больш узмацняе грані таго і другога. Таму ў літаратуры часта перад самым моцным трагічным эпізодам уводзіцца камічная сцэна, якая дае магчымасць набрацца сіл для далейшага велізарнага эмацыянальнага ўздыму. Сувязь трагічнага і камічнага ў мастацтве не выпадковая. Яна капіруе складанасці самога жыцця, дзе перакручаны смех і слёзы, спалучаюцца самыя супрацьлеглыя з'явы, нічога не існуе адасоблена ад іншага. І ўсё ж як ні шчыльна спалучаюцца ў жыцці і ў мастацтве трагічнае і камічнае, кожная з гэтых эстэтычных катэгорый мае свае выразныя асаблівасці.

Трагічнае – гэта перадусім гора і пакуты, камічнае – найперш смех. Але сам па сабе смех – гэта яшчэ не камічнае. Мы смяемся, калі пачуем забаўную гісторыю або анекдот, убачым вясёлую сцэну, жартуем з чаго-небудзь, хаваем няёмкасць і да т.п., аднак усё гэта яшчэ не камічнае. Зразумела, камічнага не бывае без смешнага (інакш якое б гэта было камічнае), але камічнае і смешнае – гэта не адно і тое ж. Якія б камічныя творы або камічныя здарэнні ў жыцці мы ні бралі, у іх заўсёды ёсць не толькі смех, але яшчэ і ацэнка таго, над чым мы смяемся.

Камічнае – гэта заўсёды сцвярджэнне або адмаўленне, якія вызначаюцца паводле таго ці іншага ўзору. Тое, што адпавядае ўзору, – ухваляецца; тое, што не – адмаўляецца. У эстэтычнай ацэнцы рэчаіснасці такім узорам з'яўляецца ўяўленне аб прыгожым, пэўны эстэтычны ідэал. Смехам асуджаецца тое, што не сумяшчаецца з эстэтычнымі ідэаламі (нормамі), супярэчыць ім. А паколькі эстэтычныя ідэалы (нормы) заўсёды вызначаюцца грамадствам і пануючымі ў ім поглядамі, то праз яго камічнае аказваецца заўсёды шчыльна звязаным з пэўнымі грамадскімі ідэаламі (нормамі), у тым ліку этычнымі. Як заўважае польскі тэарэтык камічнага Б. Дземідок, «неад'емная, але не адзіная ўмова ўзнікнення ўспрыняцця камічнага» – гэта «наяўнасць у свядомасці суб'екта з'явы, якая адхіляецца ад нормы», таму «менавіта канцэпцыя адхілення ад нормы» з'яўляецца найбольш прымальнай «для стварэння больш або менш закончанай і здавальняльнай тэорыі камічнага» [7, с. 53, 54].

Людзьмі здаўна высмейваліся чалавечыя недахопы і слабасці: глупства, няспрытнасць, хвальба, баязлівасць і інш. Усе яны маглі быць камічнымі пры ўмове, што не выклікаюць пакут, не з'яўляюцца для

чалавека небяспечнымі. Для таго каб гэтыя недахопы пачалі выклікаць смех, неабходна ўбачыць ці прадставіць іх у смешным выглядзе, бо самі па сабе яны не заўсёды смешныя. Сапраўдны камічны эфект узнікае толькі пры пэўных умовах. У гэтай сувязі прынята размяжоўваць камічнае на два віды: па-першае, элементарна-камічнае, якое знаходзіцца на паверхні (камізм вонкавага выгляду, становішча, руху, выніку, рэплік і г.д.), увесь час узнікае і знікае ў залежнасці ад суб’ектыўных уяўленняў аб тых ці іншых эстэтычных і грамадскіх ідэалах (нормах); па-другое, сацыяльна-камічнае, якое з’яўляецца глыбінным (камізм тыповых з’яў, характараў, поглядаў і г.д.), абумоўлена ўстойлівымі, аб’ектыўнымі грамадска-эстэтычнымі ідэаламі (нормамі) [15, с. 21 – 25].

Камічнае заўсёды ўзнікае там, дзе ёсць супярэчанне (неадпаведнасць). Але на тое, якія менавіта супярэчанні садзейнічаюць узнікненню камічнага, погляды даследчыкаў у значнай ступені разыходзяцца: ці гэта супярэчанні прыгожага з пачварным, нязначнага з узвышаным, мізэрнага з агромністым, мэт і сродкаў іх дасягнення, памкненняў і вынікаў дзеяння, унутранай нікчэмнасці і знешняй значнасці, з’яў аб’ектыўнай рэчаіснасці і грамадскіх ідэалаў і г.д. Зразумела, пералічаныя супярэчанні, якія здольны ўтвараць камічныя сітуацыі, характары і абставіны, не аднолькавыя па сваёй значнасці. Адно – супярэчанне паміж жаданнем выглядаць кімсьці і тым, што чалавек з сябе ўяўляе ў сапраўднасці, і зусім іншае – паміж грамадскімі ідэаламі і тымі з’явамі, што існуюць рэальна. У першым выпадку неадпаведнасць можа выклікаць лёгкую ўсмешку і добразычлівы смех, у другім – бязлітаснае асмяянне. У залежнасці ад таго, менавіта якія з’явы і якія супярэчанні становяцца асновай камічнага, яго адценні будуць істотна адрознівацца. Аднак у любым выпадку, паводле поглядаў Ю.Б. Борава, камічнае – гэта «грамадска адчувальная супярэчнасць, грамадска значная аб’ектыўная неадпаведнасць (мэты – сродкам, формы – зместу, дзеяння – акалічнасцям, сутнасці – яе праяўленню, прычыны – выніку і г.д.)» [5, с. 43 – 44]. Аднак для таго, каб камізм не быў павярхоўным, элементарным, ён павінен выкрываць унутраныя супярэчнасці ў самім аб’екце высмейвання.

Яшчэ адной асаблівасцю камічнага з’яўляецца тое, што нехта (напрыклад, камедыйны персанаж) можа выглядаць і паводзіць сябе сур’ёзна, але яго выгляд і ўчынкі выклікаюць у астатніх шчыры смех. Гэта можа быць абумоўлена рознымі памылкамі, непаразуменнямі, недарэчнасцямі і да т.п. На іх вельмі часта будуецца камічны эфект ва ўсіх відах мастацтва. Напрыклад, у камедыях Ж.-Б. Мальера, П. Бамаршэ, У. Шэкспіра і іншых знакамітых драматургаў адна з камічных сітуацый абавязкова ўзнікае з прычыны нейкага непаразумення, нейкай блытаніны. Так, хваляванні і перажыванні Фігара ў п’есе Бамаршэ «Жаніцьба Фігара» былі выкліканы тым, што яму падалося, нібы яго нявеста Сюзана неабыякава да графа Альмавівы і гатова адказаць на яго пачуцці. Але глядач ведае, што Сюзана паводзіць сябе з Альмавівай так, як і належыць добрай дзяўчыне, і толькі разыгрывае яго, далучаючы да гэтага і жонку Альмавівы, якая пераапранаецца ў адзенне Сюзаны, аб чым Фігара, зразумела, нічога не ведае. Таму яго гнеў, падазрэнні і папрокі нявесце выглядаюць вельмі смешна. У п’есе У. Шэкспіра «Дванаццатая ноч» шмат смешнага і вясёлага ўзнікае з-за таго, што двое блізнятаў, Віола і яе брат Себасцьян, вельмі падобныя адзін да аднаго, амаль як дзве кроплі вады, і іх увесь час блытаюць. Дарэчы, адна з п’ес У. Шэкспіра называецца «Камедыя памылак» і цалкам пабудавана на памылках, недарэчнасцях, выпадковасцях, якія абумоўліваюць яе камічны эфект. Памылкі, непаразуменні, недарэчнасці з’яўляюцца адной з самых дзейсных крыніц камічнага і ў жыцці, і ў мастацтве.

Нельга не адзначыць і яшчэ адну асаблівасць камічнага, якая заключаецца ў тым, што сфера яго дзеяння – гэта толькі жыццё чалавека, грамадства. «Ні трагічнага, ні камічнага ў прыродзе няма» [16, с. 3]. Камічнае і звязаны з ім смех уласцівы толькі чалавеку, з’яўляюцца вынікам толькі чалавечай ацэнкі рэчаіснасці. Яшчэ Арыстоцель адзначаў, што менавіта смех адрознівае чалавека ад жывёлы, а буйнейшы камедыёграф сусветнай літаратуры, французскі драматург Ж.-Б. Мальер, лічыў адметнай уласцівасцю чалавека пачуццё гумару.

Але праз смех выяўляецца не толькі прадмет высмейвання, але і характар таго, хто смяецца. Тое, над чым смяецца чалавек, яскрава характарызуе яго самога. Калі хто смяецца з фізічных недахопаў іншага, гэта дрэнны смех благога чалавека, калі ж смяюцца над глупствам, духоўнымі недахопамі – гэта сведчанне розуму і высокіх маральных прынцыпаў. Паводле шырока вядомых меркаванняў выдатнага майстра камічнага, расійскага пісьменніка М.В. Гогаля, «сапраўднае мастацтва вучыць смяяцца не над крывым носам, а над крывой душой».

У кожнай эпохі з гісторыі чалавецтва былі свае заганы, якія станавіліся прадметам асмяяння. Але як бы ні змяняліся погляды людзей, якія б новыя рысы не ўносіў у іх час і грамадскія пераўтварэнні, аб’ектам смеху было і застаецца ўсё дробнае, пачварнае, эгаістычнае, благое ў характары чалавека і ў адносінах паміж людзьмі. Камічным заўжды было невуцтва, фанабэрыстасць, хвальба, глупства, жаданне паказацца не такім, якім на самой справе з’яўляецца чалавек. Аднак галоўнае ў камічным – гэта выкрыц-

цё сацыяльных заган, высмейванне старога, ужо непатрэбнага ў жыцці, але яшчэ дзейснага і таму вельмі часта небяспечнага для прагрэсу. Смеючыся з сацыяльных заган, чалавек адчувае сябе больш моцным, яны перастаюць яго палохаць. У гэтым выяўляецца сацыяльная сутнасць камічнага – праз высмейванне сацыяльных заган садзейнічаць сцвярджэнню новага, прагрэсіўнага ў жыцці грамадства.

Камічнае вельмі шматгранна ў жыцці і ў мастацтве. У залежнасці ад таго, што выклікае смех, узнікае мноства адценняў камічнага – ад жарту да гумару, ад бяззлобнага смеху да бязлітаснай сатыры, якая прызначана выкрыць агідныя з’явы жыцця. Асноўнымі разнавіднасцямі камічнага ў мастацтве з’яўляюцца гумар і сатыра.

Гумар – гэта пераважна зычлівае высмейванне жыццёвых з’яў, чалавечых характараў, нязначных недахопаў у чым-небудзь, якое можа суправаджацца рознымі адценнямі (грубасці, з’едлівасці і інш.), але ў цэлым засноўваецца на станоўчых адносінах да прадмета смеху. З дапамогай гумару часта парушаюцца звыклыя, тыповыя сувязі паміж рэчамі, якія ставяцца ў нечаканае становішча, што адкрывае ў іх новыя, арыгінальныя бакі. Гумар мае яскравыя нацыянальна-культурныя асаблівасці. Напрыклад, адметнасцю беларускага народнага гумару лічыцца «слоўна-вобразная канкрэтыка, сацыяльная і псіхалагічная дакладнасць гумарыстычнага малюнка» [17, с. 231].

Сатыра – найвышэйшая форма крытыкі і высмейвання, спосаб выкрыцця заган, з якімі нельга пагадзіцца ні ў якім выпадку. Сатыра – гэта бязлітасны смех, які даводзіць да гранічнай мяжы сутнасць той грамадскай з’явы або таго характару чалавека, што выкрываюцца. Сатыра скіравана толькі на адмоўныя з’явы чалавечага жыцця і толькі на заганы асобных людзей. З дапамогай сатырычнага смеху адмаўляецца негатыўнае, старое і сцвярджаецца перадавое, новае, знішчаюцца аджылыя эстэтычныя і/або этычныя ідэалы ў грамадстве і ўсталёўваюцца тыя, якія адпавядаюць духу часу.

Сатыра як від камічнага мае свае спецыфічныя ўласцівасці. Адной з іх з’яўляецца злабадзённасць. Ніхто не будзе смяяцца з таго, што не здаецца важным, не закранае, не хвалюе. Абавязковая ўмова сатырычнага – зварот да сучаснасці. Яшчэ адна адметнасць сатыры заключаецца ў тым, што яна ніколі не імкнецца да праўдападобнасці, дакладнага адлюстравання жыцця. Сатыра гіпербалізуе характары, абвастрае іх асобныя бакі, даводзіць абставіны да гранічнага. Галоўнае для сатыры – выкрыць, зрабіць відавочна негатыўным тое, супраць чаго яна накіроўвае сваю вастрыню. Сатыра не ведае жалю.

Галоўная задача сатыры, у адрозненне ад гумару, – прымусіць убачыць тыя заганы і недахопы, міма якіх людзі звычайна праходзяць, не заўважаюць іх у сваім паўсядзённым жыцці. Смех у сатыры жорсткі таму, што ён накіраваны на ўсё тое, што не адпавядае сацыяльным, эстэтычным і маральным ідэалам. Сатыра не мае нацыянальна-культурных адметнасцей, яна інтэрнацыянальная па сваёй сутнасці.

Камічны эфект у літаратурных тэкстах дасягаецца рознымі сродкамі, адны з якіх маюць дачыненне да зместу (камічныя сюжэт, канфлікт, сітуацыя, паводзіны персанажа і г.д.), а другія – да формы (моўныя сродкі – фанетычныя, лексічныя, граматычныя і інш.). Можна пагадзіцца з тым, што камічнага эфекту можна дасягнуць толькі ўмелым выкарыстаннем як моўных, так і нямоўных сродкаў. «Аднак нельга адмаўляць і таго факта, што самымі камічна дзейснымі з’яўляюцца моўныя (маўленчыя) сродкі» [14, с. 6]. Так, аднойчы англійскі драматург Б. Шоў, што вылучаўся вострым пачуццём гумару, калі пачынаючы акцёр настойліва прасіў у яго рэкамендацыю ў тэатр, напісаў да дырэктара тэатра ліст наступнага зместу: *«Шчыра рэкамендую Вам маладога акцёра. Ён можа* ***іграць*** *Гамлета, Шэйлака, Цэзара, на флейце. Лепей за ўсё ён* ***іграе*** *на флейце».* Тут камічны эфект узнікае з-за кантраста, супярэчнасці, аднак смех выклікае менавіта тое, што Б. Шоў карыстаецца мнагазначнасцю слова *іграць*, ужывае гэтае слова адначасова ў розных сэнсах. У камічным выяўляецца стаўленне пісьменніка або персанажа да навакольнага свету, тая ці іншая яго ацэнка, таму ўсе моўныя сродкі камічнага гэта яшчэ і сродкі дасягнення экспрэсіі за кошт надання словам, акрамя іх патэнцыйных экспрэсіўных значэнняў, яшчэ пэўнай дадатковай экспрэсіі, якую і можна называць «камічнай». Камічная экспрэсія ўзнікае ў выніку мэтанакіраванага адхілення аўтара ад існуючых норм літаратурнай мовы. Камічны эфект узмацняецца, калі пералічаныя вышэй сродкі ўжываюцца ў тэксце канцэнтравана.

**Вывады.** Асноўнымі прыметамі камічнага можна лічыць смехавую прыроду, станоўчую або негатыўную ацэнку прадмета смеху, характарызацыю суб’екта смеху, лакалізацыю ў жыцці чалавека і грамадства, апора на памылкі, непаразуменні, недарэчнасці, адхіленне ад існуючых норм, адпаведнасць аб’ектыўным эстэтычным і/або этычным ідэалам, наяўнасць сацыяльна значнай неадпаведнасці, супярэчнасці, імкненне да сцвярджэння новага, прагрэсіўнага. Асноўнымі відамі камічнага з’яўляюцца гумар і сатыра, паміж якімі знаходзіцца вялікая колькасць адценняў смеху, які па сваёй сутнасці з’яўляецца амбівалентным, што абумоўлівае сінкрэтычную прыроду камічнага як арганічнай часткі жыцця чалавека і грамадства. Камічны эфект дасягаецца рознымі сродкамі, якія могуць быць зместавыя (канфлікт, сіту-

ацыя і г.д.) і фармальныя (маўленчыя), і залежыць ад умелага выкарыстання як зместавых (нямоўных), так і фармальных (моўных) сродкаў, сярод якіх самымі дзейснымі з'яўляюцца моўныя (маўленчыя) сродкі.

ЛІТАРАТУРА

1. Борев, Ю.Б. О комическом / Ю.Б. Борев. – М.: Искусство, 1957. – 232 с.
2. Мінчін, Б.М. Деякі питання теорії комічного / Б.М. Мінчін. – Кіїв: Вид-во АН УССР, 1959. – 240 с.
3. Bystroń, J.S. Komizm / J.S. Bystroń. – Wrocław: Zakład narodowy im. Ossolińskich, 1960. – 437 s.
4. Лук, А.Н. О чувстве юмора и остроумии / А.Н. Лук. – М.: Искусство, 1968. – 191 с.
5. Бореев, Ю.Б. Комическое / Ю.Б. Борев. – М.: Искусство, 1970. – 269 с.
6. Escarpit, R. L'humour / R. Escarpit. – Paris: Presses Univ. de France, 1972. – 127 p.
7. О комическом: пер. с польск. – М.: Прогресс, 1974. – 223 с.
8. Пропп, В.Я. Проблемы комизма и смеха / В.Я. Пропп. – М.: Искусство, 1976. – 183 с.
9. Бахтин, М.М. Творчество Франсуа Рабле и народная культура средневековья и Ренессанса / М.М. Бахтин. – 2-е изд. – М.: Худ. лит., 1990. – 543 с.
10. Esar, E. Humorous English: A guide to comic usage, jocular speech and writing and witty grammar / E. Esar. – New York: Horizon Press, 1961. – 318 p.
11. Pocheptsov, G.G. Language and Humour / G.G. Pocheptsov. – Kiev: Higher School, 1974. – 318 p.
12. Коржева, П.Б. Язык юмора и сатиры: Из истории развития речевых средств в создании комического эффекта в русской литературе / П.Б. Коржева. – Алма-Ата: Мектеп, 1979. – 120 с.
13. Походня, С.И. Языковые виды и средства реализации иронии / С.И. Походня. – Киев: Наукова думка, 1989. – 128 с.
14. Рагаўцоў, В.І. Маўленчае выражэнне камічнага ў беларускай драматургіі / В.І. Рагаўцоў. – Магілёў: МДУ имя А.А. Куляшова, 2002. – 304 с.
15. Николаев, Д.П. Смех – оружие сатиры / Д.П. Николаев. – М.: Искусство, 1962. – 223 с.
16. Борев, Ю.Б. Трагическое и комическое в действительности и в искусстве / Ю.Б. Борев. – М.: Знание, 1955. – Сер. VI. – № 14. – 32 с.
17. Кенька, М.П. Гумар / М.П. Кенька // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: у 5 т. – Мінск: БелСЭ, 1985. – Т. 2. – С. 231.

*Пастунiў 18.10.2007*